**УДК 94:323.269.6((476+474.5)-470.332)«15»**

***Н. І. Макушчанка***

# КАЗАЦКА-СЯЛЯНСКАЯ ВАЙНА 1648–1651 ГАДОЎ У СМАЛЕНСКІМ ВАЯВОДСТВЕ ВКЛ

*Артыкул прысвечаны казацка-сялянскай вайне 1648–1651 гг. Вывучаны матэрыялы беларускай, польскай, расійскай і ўкраінскай гістарыяграфіі. З прааналізаваных матэрыялаў былі атрыманы звесткі пра ваенныя падзеі ў Смаленскім павеце Вялікага Княства Літоўскага падчас казацка-сялянскай вайны, якая разгарнулася на тэрыторыі сучасных Беларусі, Украіны і часткова Расійскай Федэрацыі ў сярэдзіне XVII ст.*

Вывучэнне казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гг. застаецца актуальным пытаннем, таму што ацэнка яе характару з'яўляецца вельмі спрэчнай і існуе некалькі трактовак гэтых падзей у беларускай, польскай, расійскай і ўкраінскай гістарыяграфіі. Казацка- сялянская вайна, якая разгарнулася на землях ВКЛ у 1648–1651 гг., была відавочнай праявай барацьбы сялянства і мяшчанства Літоўска-Рускай дзяржавы супраць этнаканфесійнай палітыкі кіруючых колаў Рэчы Паспалітай і сацыяльнай палітыкі ў цэлым [1, с. 37]. Прычынай гэтай вайны 1648–1651 гг. з'яўляецца складаны комплекс сацыяльных і этнаканфесійных праблем, якія аформіліся на землях ВКЛ на працягу канца XVI – першай паловы XVII стагоддзя. Сярод іх неабходна адзначыць станаўленне фальварачна-паншчыннай сістэмы, якое суправаджалася эксплуатацыяй сялян; рэлігійныя супярэчнасці, звязаныя з забаронай законнай дзейнасці дызуніцкай грэка-ўсходняй царквы і распаўсюджваннем уніяцкай царквы. У выніку этнічных, канфесійных, эканамічных і палітычных супярэчнасцяў адбыўся падзел насельніцтва ВКЛ на два процілеглыя лагеры [2, с. 74–75]. Да першага адносіліся можнаўладцы, каталіцкае і ўніяцкае духавенства, сярэдняя і дробная шляхта. Другі складаўся з вялікай колькасці беларускага сялянства і мяшчанства, а таксама часткі шляхты, якая не ўспрыняла царкоўнай уніі і казакоў-запарожцаў, якія паходзілі з беларускіх зямель ВКЛ.

Справа ў тым, што сельскае насельніцтва, якое мела да гэтага пэўную свабоду, усё больш занявольвалася памешчыкамі. Сяляне абкладаліся непасільнымі паборамі. Усё гэта выклікала хваляванні сярод народа, якія ўціхамірваліся жорсткімі мерамі ўладаў Рэчы Паспалітай.

Уварванне казакоў у Літоўскую Русь і хуткі захоп імі Палесся дало пачатак "казацкаму тэрору". Ахвярамі казакоў стала мясцовая шляхта каталіцкай канфесіі. Асаблівай жорсткасці з боку казакоў падвергліся яўрэйскае насельніцтва. Ніжэйшыя пласты беларускага насельніцтва аказвалі падтрымку казацкаму руху, дзякуючы этнаканфесіянальнай блізкасці і агульным сацыяльна-эканамічным і палітычным праблемам. Да казацкіх загонаў сталі далучацца мясцовыя сяляне і мяшчане [3, с. 103–106]. У многіх паветах і гарадах сяляне самі адкрывалі вароты казакам і далучаліся да іх. А затым прымалі ўдзел у спусташэнні дамоў паноў, цэркваў уніятаў, каталікоў, распраўляліся з арандатарамі, шляхціцамі і ксяндзамі. У Старадубскім павеце Смаленскага ваяводства мясцовыя сяляне, перабіўшы сваіх паноў, збеглі за мяжу Расійскай дзяржавы [4, с. 227]. "Казацкі тэрор", які панаваў на Палессі і ў Падняпроўі летам 1648 г., заспеў таксама саміх сялян і мяшчан. Гэта адбылося з-за саюза казакоў з татарамі. Характэрнай асаблівасцю для казацка-сялянскай вайны былі сумесныя выступленні сялян, казацка- сялянскіх атрадаў і зліццё іх з рухам гарадскіх нізоў. У гэтай жорсткай барацьбе прынялі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўдзел практычна ўсе пласты насельніцтва ВКЛ [5, с. 210; 6].

Многія магнаты і шляхцічы беглі на захад, баючыся расправы. Спробы самастойна стрымаць націск казацка-сялянскіх атрадаў былі няўдалымі, бо гарадское насельніцтва падтрымлівала паўстанцаў.

Першым сур'ёзнай фартэцыяй на шляху казацкага палка пад камандаваннем Галавацкага на тэрыторыі ВКЛ стаў горад Старадуб Смаленскага ваяводства. Пра гэта сведчыць Самуіл Маскевіч [7, с. 884]. Пасля ўзяцця Старадуба П. Галавацкі атрымаў распараджэнне ад Б. Хмяльніцкага адправіцца на Украіну, у Чарнігаў, дзе мясцовая шляхта не зламілася і працягвала супраціў [7, с. 110]. Пасля сыходу казакоў " ... харугва старадубскай шляхты і татараў, усяго каля 100 чалавек..." пачалі наступ на Старадуб. Нягледзячы на мізэрную колькасць жаўнераў харугвы, мясцовыя паўстанцы не змаглі ўтрымаць пазіцыі, і шляхта без супраціву заняла Старадуб. Тым не менш, казакі выканалі неабходную задачу – Чарнігаў быў адрэзаны ад магчымай дапамогі, становішча ў Рэчыцкім і Старадубскім паветах дэстабілізавана. Полк Галавацкага быў заменены ў паўднёва-ўсходніх паветах ВКЛ загонамі з Нябабы, Мікуліцкага, Ф. Гаркушы, Я. Сакалоўскага, якія хутка распаўсюдзіліся па Палессі і Пасожжы [8, с. 112].

Нягледзячы на ўзмацненне сялянска-мяшчанскіх паўстанняў, сыход казакоў паказаў, што без знешняй падтрымкі паўстанне ў ВКЛ чакае правал. Заслон з чарнігаўскага і нежынскага палкоў пад камандаваннем палкоўніка М. Нябабы быў не ў стане абараніць Украіну ад небяспекі, якая навісла з поўначы. Пры створанай абстаноўцы Б. Хмяльніцкі прыняў рашэнне нанесці ўдар па праціўніку з тылу, каб папярэдзіць удар па Кіеве. Казацкія атрады павінны былі абысці войска Радзівіла з усходу, які па тэрыторыі ўваходзіў у склад Расіі Бранскага павета. Затым захапіць Рослаў, Крычаў, Мсціслаў, Оршу, Смаленск і, злучыўшыся з беларускімі сялянамі і гарадской беднатой, адначасова з палкамі М. Нябабы ўдарыць па войску Радзівіла.

1 чэрвеня казакі з рускай тэрыторыі пайшлі на Рослаў, які ўзялі без бою, а шляхцічы і падваевода «як апараныя» збеглі ў Смаленск [10, с. 74]. Да казакоў паўсюдна далучаліся сяляне. У кароткі тэрмін паўстанне ахапіла Смаленшчыну. На гэтым этапе вызваленчай вайны ў барацьбе супраць магнатаў і шляхты разам з украінцамі і беларусамі прынялі ўдзел сяляне і гарадская бяднота рускіх паветаў Вялікага Княства Літоўскага [11, с. 71].

У другой палове ліпеня 1648 г. у Мсціслаўскім і Смаленскім ваяводствах разгарнуўся паўстанцкі рух, які актывізаваў дзейнасць казачых атрадаў са Старадубскага павета, на тэрыторыі якога быў створаны буйны казачы цэнтр у Паповай гары (цяпер Чырвоная гара, Расія). Для падаўлення казацка-сялянскай вайны, феадалы Рэчы Паспалітай і каталіцкая царква выдзелілі велізарныя сродкі для набыцця наймітаў з Еўропы [12, с. 318].

Вайна прывяла да істотных гаспадарчых, дэмаграфічных і палітычных наступстваў. Канстытуцыі сеймаў 1649, 1651 і 1653 гадоў сведчаць аб заняпадзе гаспадаркі ў краіне. У 1649 г. для ВКЛ быў зацверджаны надзвычайны падатак, які не быў стандартным для ўсёй дзяржавы з-за моцных разбурэнняў у паветах. Так, напрыклад, Брэсцкі, Пінскі і Мсціслаўскі выплочвалі на 30 % менш, Мазырскі і Рэчыцкі паветы – 25 %, але толькі пры ўмове, што яны будуць вольныя ад ворагаў, а ў 1650 г. Старадубскі і Мсціслаўскі паветы ўвогуле вызвалілі ад падаткаў. Сеймавая канстытуцыя 1653 г. канстатавала, што Рэчыцкі і Мазырскі паветы не могуць плаціць падаткі [13, с. 32]. У інтарэсах жызуніцкай шляхты і мяшчан кароль Ян Казімір пацвердзіў іх правы. Улада пайшла насустрач паўстаўшым мяшчанам: "…мяшчан Кіеўскіх, Чарнігаўскіх, Вінніцкіх, Мазырскіх, Рэчыцкіх, Старадубскіх, Пінскіх і інш., куды б ні прыйшла вайна, пры старых правах і свабодах пакідаем" [14, с. 254]. Неабходна заўважыць, што падчас казацка-сялянскай вайны меў месца як казацкі, так і шляхецкі тэрор [15]. Адносіны ў грамадстве былі занадта складанымі і напаленымі, таму вырашыць супярэчнасці мірным шляхам было немагчыма. Менавіта гэта і надало вайне такі жорсткі і бескампрамісны характар. У выніку казацка- сялянскай вайны ВКЛ страціла частку сваіх тэрыторый. Са

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

складу княства фактычна выйшаў Старадубскі павет Смаленскага ваяводства, які знаходзіўся з 1648 года пад кіраваннем казакоў. У 1654 г. на тэрыторыі гэтага павета быў створаны Старадубскі полк, што прывяло да канчатковай страты Браншчыны.

**Літаратура**


1 Чаропка, С. А. Гістарыяграфія Казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гг. на Беларусі // Известия Гомельского государственного университета имени Франциска Скорины. – 2006. – № 2 (35). – С. 37–44.

2 Чаропка, С. А. Берасцейская царкоўная ўнія і раскол у "Грэка-рускай царкве" Рэчы Паспалітай / С. А. Чаропка // Известия Гомельского государственного университета имени Франциска Скорины. – 2020. – № 4 (121). – С. 74–79.

3 Документы об освободительной войне украинского народа 1648–1654 гг. – Киев : Наукова думка, 1965. – 825 с.

4 Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссией (АЮЗР). – Санкт-Петербург : тип. П. А. Кулиша, 1861. – Т. 3. : 1638–1657 / под ред. Н. Костомарова. – 604, 134, 22 с.

5 Мелешко, В. И. Классовая борьба в белорусской деревне во второй половине XVII–XVIII в. / В. И. Мелешко – Минск : Наука и техника,1982. – 254 с.

6 Чаропка, С. А. Тэрор як форма барацьбы ў казацка-сялянскай вайне 1648–1651 гадоў на Беларусі // Известия Гомельского государственного университета имени Франциска Скорины. – 2016 – № 4 (97). – С. 67–72.

7 Джерела з історії Національно-визвольної війни українського народу. – Київ : Канадський інститут українських студій, 2012. – Т. 1. – 670 с.

8 Kotłubaj, E. Życie Janusza Radziwiłła / E. Kotłubaj. – Wilno; Witebsk : Nakł. M. Mindelsona, 1859. – 460 s.

9 Pamiętniki Albrychta Stanisława X. Radziwiłła kanclerza W. Litowskiego : w 2 t. / Wydane z rękopismu przez Edwarda Raczyńskiego. – Poznań : u braci Scherków, 1889. – T. 2. – 490 s.

10 Абецедарский, Л. С. Борьба украинского и белорусского народов за объединение с Россией в середине XVII века / Л. С. Абецедарский. – Минск : Высшая школа, 1976. – 150 с.

11 Лочмель, И. Ф. Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов / И. Ф. Лочмель. – Москва : Воен. Изд-во народного комиссариата обороны Союза ССР, 1940. – 162 с.

12 Воссоединение Украины с Россией. Документы и материалы (К 300-летию. 1654–1954) : в 3 т. / Акад. наук СССР. Ин-т истории. Акад. наук УССР. Ин-т истории; редкол. : П. П. Гудзенко (гл. ред.) [и др.]. – Москва : АН СССР, 1953. – Т. 2 : 1648–1651. – 558 с.

13 Morzy, J. Kryzisdemograficzny na Litwie i Białorusi w 2 połowie XVII wieku / J. Morzy – Poznań, 1965. – 405 s.

14 Actumin Curia Regia Varsauien // Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. – Минск : В Губернской типографии, 1848. – С. 250–255.

15 Коялович, М. И. Чтения по истории западной России / М. И. Коялович. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя / ред. совет.: Г. П. Пашков, пред. [и др.], 2006. – 476 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ